*Андрэй Блінец*

# ДАСЛЕДАВАННІ РАДЗІВІЛАЎСКАЙ КРЫПТЫ Ў 2016 г.

Радавы некропаль князёў Радзівілаў у сутарэннях нясвіжскага касцёла Божага Цела з'яўляецца ўнікальным помнікам канца XVI – пачатку XX стст. і адным з буйнейшых маўзалеяў на тэрыторыі Еўропы. Аналагічныя яму арыстакратычныя пахаванні ёсць у Вене (Капуцынер Груфт – маўзалей дома Габсбургаў) і каля Мадрыда (Эскарыял – пахаванне іспанскіх манархаў). У мінулым стагоддзі ў нясвіжскай крыпце некалькі разоў праводзіліся работы па вывучэнні і інвентарызацыі (у 1905, 1953 і 1999 гг.), але для спецыялістаў тут яшчэ шмат працы. Такі ўнікальны аб'ект, як маўзалей Радзівілаў, павінен быць усебакова даследаваны і архітэктарамі, і гісторыкамі. Трэба прааналізаваць увесь комплекс пісьмовых крыніц, звязаных з яго гісторыяй, а таксама прасачыць храналогію пахаванняў.

Цікавасцю да некропаля не ў апошнюю чаргу абумоўлены значны прыток турыстаў у касцёл Божага Цела. Але трэба ўлічваць, што крыпта стваралася як сямейны маўзалей, а не турыстычны аб'ект. Яна не прыстасаваная да масавых наведванняў. Неўрэгуляванасць турыстычных патокаў і ігнараванне некаторых мер перасцярогі ў апошнія часы прывяла нават да страт асобных аўтэнтычных элементаў. Так, была страчаная пячатка Папы Рымскага Бенядзікта XIV з мемарыяльнай шыльды пры ўваходзе ў крыпту. І гэта не адзіная праблема. Спецыялістамі не аднойчы адзначаўся нездавальняючы стан касцёльных сутарэнняў: разбураюцца драўляныя саркафагі, у якія змешчаны труны, знікае насценны роспіс. Калі ў бліжэйшы час не будуць пачатыя комплексныя работы па кансервацыі-рэстаўрацыі, то аўтэнтычныя элементы могуць быць цалкам страчаныя, і помнік згубіць сваю прывабнасць.




*Свінцовыя пломбы 1905 г. на радзівілаўскіх саркафагах.*

Каб захаваць унікальны маўзалей і стварыць належныя ўмовы для яго наведвання, неабходна правесці комплексныя даследаванні, на падставе якіх распрацаваць праграму па кансервацыі-рэстаўрацыі. Для ажыццяўлення гэтай мэты быў падрыхтаваны сумесны літоўска-беларускі праект «Даследаваннне і канцэпцыя прыстасавання да наведвання пахавальні княжацкага роду Радзівілаў у крыпце нясвіжскага касцёла». Кіраўніком праекта з літоўскага боку стала Аўдроне Вішняўскене – галоўны дзяржаўны інспектар Дэпартамента па культурнай спадчыне пры Міністэрстве культуры Літоўскай рэспублікі. Яна працавала ў крыпце яшчэ ў 1999 г., калі праводзілася інвентарызацыя маўзалея. З беларускага боку работу каардынаваў Сяргей Клімаў – дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». Праграма дзеянняў была ўзгодненая з навуковым кіраўніком рэстаўрацыі касцёла, галоўным архітэктарам ТАА «Белрэстаўрацыя» Андрэем Карпуком.

З літоўскага боку ў склад групы спецыялістаў увайшлі выкладчыкі і супрацоўнікі Вільнюскага ўніверсітэта: Сальвіюс Кулявічус, Марціс Якуліс (гісторык), Альбінас Кунсявічус (гісторык), Юстына Казакайтэ (антраполаг); архітэктар Рымас Грыгас; рэстаўратары Гінтарас Казлаўскас (удзельнік інвентарызацыі 1999 г.), Кестуціс Норкунас, Індра Валкюнене, Вітаўтэ Лукшэнене, а таксама супрацоўнікі Дэпартамента па культурнай спадчыне пры Міністэрстве культуры. Ад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у рабоце ўдзельнічалі начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Ігар Чарняўскі і яго намеснік Аксана Сматрэнка; супрацоўнікі музея-запаведніка «Нясвіж»:



*Бетонная сцяжка на цаглянай падлозе крыпты.*

намеснік дырэктара па навуковай рабоце Зміцер Яцкевіч, начальнік рэстаўрацыйнага аддзела Вольга Ціхінская; рэстаўратары: Ніна Язерская, Віталій Качура, Ірына Валынец; вядучы спецыяліст па экскурсійнай рабоце Сяргей Чысцякоў (удзельнік інвентарызацыі маўзалея ў 1999 г.). На розных этапах да работы падключаліся спецыялісты ў галіне археалогіі (Андрэй Вайцяховіч, Інстытут гісторыі НАН Беларусі), антрапалогіі (Мікалай Памазанаў, Інстытут гісторыі НАН Беларусі), біялогіі (Вольга Емяльянчык, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт). У абмеркаванні пастаўленых праблем прымалі ўдзел ксёндз-пробашч парафіі касцёла Божага Цела Пётр Шарко і намеснік старшыні Нясвіжскага райвыканкама Міхаіл Афанасік.

Айчынныя спецыялісты, на жаль, не маюць належнага досведу па рабоце ў касцёльных крыптах і сямейных маўзалеях шляхецкіх сядзібаў. У савецкі час амаль усе пахаванні, як царкоўныя, так і свецкія, былі разбураныя. Літве ў гэтых адносінах пашанцавала значна больш. Таму ў чэрвені 2016 г. група супрацоўнікаў Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» наведала Літву, дзе азнаёмілася з заканадаўчай базай і практыкай работ па выкарыстанні пахавальняў у якасці турыстычных аб’ектаў, захаваннем трун і саркафагаў.

У ліпені адбыўся першы візіт літоўскіх спецыялістаў у Нясвіж, падчас якога прайшоў візуальны агляд і фотафіксацыя стану крыпты. У жніўні былі праведзены даследаванні шэрагу пахаванняў і майстар-класы літоўскіх рэстаўратараў. Ішлі назіранні за тэмпературна-вільготнасным рэжымам. У лістападзе 2016 г. адбылася выніковая канферэнцыя, на якой былі падагульненыя вынікі работ і распрацаваныя рэкамендацыі па далейшых дзеяннях.

З вялікай упэўненасцю можна гаварыць, што стварэнне княжацкай крыпты ў касцёле Божага Цела было прадугледжана яшчэ на стадыі праектавання. Адначасова пад касцёлам знаходзіліся пахаванні выкладчыкаў і студэнтаў Нясвіжскага езуіцкага калегіума. Паступова іх пераносілі на асобныя могілкі, а вызваленую прастору займалі радзівілаўскія саркафагі. З цягам часу першасныя памеры крыпты аказаліся занадта малымі, і па ініцыятыве Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі ў сярэдзіне XVIII ст. яе пашырылі на поўдзень, а таксама зрабілі асобнае памяшканне ў заходнім накірунку. У 1740-я гг. з асноўным аб'ёмам пахавальні была злучаная крыпта, якая знаходзілася пад галоўным алтаром касцёла і куды вёў асобны ўваход. Такім чынам, усе разрозненыя памяшканні ўтварылі адзінае цэлае.

Работы паказалі, што сённяшняе размяшчэнне саркафагаў у цэнтральнай галерэі не супадае з надпісамі на мемарыяльных табліцах. Пераблытаныя пахаванні мужчын і жанчын. Пры гэтым самі муміі добра захаваліся. На іх няма слядоў пашкоджанняў або наўмыснага псавання. Аднак спосаб бальзаміравання, які выкарыстоўваўся ў XVII ст., застаецца невядомым. Каб яго зразумець, трэба правесці паглыбленыя даследаванні мяккіх тканін. Увогуле, ацэнка магчымасці ідэнтыфікацыі парэшткаў пахаваных стала адной з галоўных задач даследчыкаў. Былі агледжаныя ўсе элементы вопраткі, праведзена іх супастаўленне з апісаннямі адзення пахаваных. Выяўленыя элементы вопраткі ідэнтыфікаваліся як з дапамогай візуальных выяў, так і аналізу матэрыялу. Але такі спосаб не дазваляе цалкам вырашыць праблему, тым больш, што ў 1905 г. многія целы пахаваных Радзівілаў былі пераапранутыя ў тыпавую вопратку. На думку айчынных спецыялістаў, для ідэнтыфікацыі асоб (іх гендэрнай прыналежнасці і ўзросту) неабходна выкарыстоўваць метады крыміналістычнага аналізу.



*Кестуціс Норкунас ажыццяўляе апрацоўку шыльды пры ўваходзе ў крыпту.*

Зандаж насценнага роспісу, праведзены Індрай Валкунене, паказаў, што яго неаднойчы перапісвалі. Верхні слой, які сёння бачаць наведвальнікі, гэта роспіс, зроблены ў 1905 г. па ініцыятыве Радзівілаў. Пад ім знаходзяцца слаі XIX і XVIII стст., а яшчэ глыбей – самы ранні роспіс часоў Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі. Але без дадатковага вывучэння немагчыма сказаць, наколькі поўна ён захаваўся. Усе слаі роспісу адрозніваюцца колеравай гамай. Роспіс XX ст. вызначаецца кантрастным чорным контурам, для жывапісу XIX ст. ўласцівыя охрыстыя і чырвоныя адценні. Ружовыя і бэзавыя колеры – прыкмета роспісу XVIII ст.

Галоўную небяспеку для крыпты сёння ўяўляюць высокая вільготнасць і павялічанае ўтрыманне соляў. Адной з прычын, якая вядзе да празмернай канцэнтрацыі вільгаці, з'яўляецца бетонная падлога, якую паклалі ў мінулым стагоддзі на цэглу XVIII ст. Работы былі выкананы якасна і на належным узроўні, але бетонны слой не дазваляе вільгаці ўздымацца з-пад зямлі. Яна ідзе ў сцены і ўжо праз іх выходзіць вонкі. Акрамя таго, з прытокам цёплага паветра на сценах утвараецца кандэнсат. Для насценнага роспісу і мемарыяльных пліт, зробленых па тэхналогіі стука, гэта сур'ёзная праблема. Некаторыя з іх ужо не пад-



*Гінтарас Казлаўскас працуе над рэстаўрацыяй гербавага картуша.*

лягаюць аднаўленню. У другіх вельмі высокае ўтрыманне соляў. Іх неабходна вымываць, для чаго пажадана здымаць пліты са сцен. Прамаруджванне з кансервацыяй можа прывесці да таго, што неўзабаве не будзе чаго захоўваць і дэманстраваць.

Архітэктар Рымас Грыгас прапанаваў некалькі спосабаў знізіць вільготнасць: прыбраць бетонную падлогу; аддаляць стокі вады ад касцёла, каб яна не канцэнтравалася каля падмурка; пачаць сушыць сцены. Ён адзначыў, што ў залежнасці ад сітуацыі можна абіраць розныя варыянты, але нельга зацягваць з прыняццем канчатковага рашэння.

Работа групы спецыялістаў дала і практычныя вынікі. Адным з самых значных стала ідэнтыфікацыя саркафага Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі. З месцам знаходжання труны заснавальніка крыпты ўзнікла блытаніна. Традыцыйна лічылася, што яго рэшткі захоўваюцца ў саркафагу № 1 пры ўваходзе ў цэнтральную галерэю, на які прымацавана шыльда з надпісам пра пахаванне першага нясвіжскага ардыната. Разам з тым на накрыўцы саркафага № 72 каля алтара Бязгрэшнага зачацця ёсць надпіс, што менавіта тут знаходзіцца труна Сіроткі. На накрыўцы захаваліся сляды мацавання ідэнтыфікацыйнай шыльды, але сама яна адсутнічае. На гэтую акалічнасць звярнуў увагу С. Чысцякоў, які больш за 20 гадоў займаецца праблематыкай захавання крыпты. Ён правёў параўнанне саркафагаў. Высветлілася, што шыльда з саркафага № 72 усталявана на саркафаг № 1. Гэта пацвердзіла і параўнанне шыльды са слядамі мацавання. На думку С. Чысцякова, такое перамяшчэнне адбылося падчас работ у 1905 г., тады саркафагі фарбавалі, і таблíцы з іх былі знятыя. Пасля адну памылкова прымацавалі да чужога саркафага. Існуе вялікая доля верагоднасці, што ў гэты ж самы саркафаг у 1905 г. была пастаўлена труна Сіроткі. С. Чысцякоў прапанаваў

перамясціць рэшткі князя-пілігрыма ў адпаведны саркафаг (№ 72) і перанесці яго ад алтара ў цэнтральную галерэю.

Літоўскія спецыялісты правялі для сваіх беларускіх калег майстар-класы па даследаваннях, кансервацыі і рэстаўрацыі надмагільных пліт (К. Норкунас), фрэскавага роспісу (І. Валкюнене), металічных саркафагаў (Г. Казлаўскас), помнікаў матэрыяльнай культуры (В. Лукшэнене) і антрапалагічных рэшткаў (Ю. Казакайтэ). Кестуціс Норкунас ажыццявіў кансервацыю мармуровай мемарыяльнай шыльды на ўваходзе ў крыпту з дабраславеннем Папы Рымскага Бенядзікта XIV (1750 г.). Яна ачышчаная ад забруджванняў, фарбы, тынкоўкі і свячнога кандэнсату, асветленыя літары тэксту. Таксама была рэканструяваная страчаная пячатка Бенядзікта XIV у цэнтры шыльды. Гінтарас Казлаўскас рэстаўраваў гербавы картуш з саркафага Канстанцыі Радзівіл-Чудоўскай (1796—1824). На жаль, умовы ў крыпце такія, што калі змясціць адноўленую пласціну з гербамі Радзівілаў і Чудоўскіх на яе ранейшае месца (на саркафаг), то яна неўзабаве страціць свой выгляд іператворыцца ў тое, чым была да рэстаўрацыі. Таму гэты артэфакт пакуль знаходзіцца ў касцёльным сховішчы.

Падчас пасяджэнняў камісіі абмяркоўваліся пытанні далейшых работ і выкарыстання крыпты ў якасці турыстычнага аб'екта. Большасць пагадзілася з тым, што закрываць крыпту ад наведвальнікаў нельга. Сам факт знаходжання ў княжацкай пахавальні аказвае моцнае эмацыйнае ўздзеянне на турыстаў. Варта распрацаваць сістэму пропуска турыстычных груп, добраўпарадкаваць сутарэнні, забяспечыць іх ахоўнай сігналізацыяй. Ксёндз-пробашч Пётр Шарко зазначыў, што святарам і прыхажанам неабходны прафесійныя рэкамендацыі па падтрыманні тэмпературнага рэжыму, своеасаблівая «інструкцыя па выкарыстанні» крыпты. Навуковы кіраўнік рэстаўрацыі Андрэй Карпук запэўніў, што такога кшталту рэкамендацыі ўжо распрацоўваюцца.

Міхаіл Афанасік, намеснік старшыні Нясвіжскага райвыканкама, адзначыў, што высновы спецыялістаў прымушаюць задумацца аб змене падыходаў да рэстаўрацыі: «Перш за ўсё сродкі трэба накіроўваць на крыпту. Не на рамонт фасада, а на стварэнне сістэмы гідраізаляцыі. Гэта дазволіць забяспечыць адвядзенне вады і вільготнасны рэжым. Калі гэта будзе зроблена, захаваецца і фасад касцёла, і яго інтэр'ер. Калі ж не будзе захаваны падмурак, то ўся работа акажацца

марнай». У якасці асноўнай канцэпцыі работ у крыпце было рэкамендавана прыняць праграму рэстаўрацыі, падрыхтаваную А. Карпуком.

Падводзячы вынікі работы, дырэктар музея-запаведніка «Нясвіж» Сяргей Клімаў сказаў: «Праграма, якую мы пачалі, вельмі важная для нас, для нашай агульнай гісторыі Літвы і Беларусі. Першыя вынікі сумеснай работы ўражваюць. Мы адгарнулі новыя старонкі гістарычных ведаў і цяпер бачым, у якім накірунку варта рухацца. Для Нясвіжа гэта важны праект. Мы павінны ісці наперад і ствараць новыя пляцоўкі, у тым ліку і музейныя, каб прывабіць сюды турыстаў, каб працавала рэгіянальная эканоміка. Уключэнне касцёла і крыпты ў праграму наведванняў вельмі важнае. А для гэтага неабходна навесці парадак і стварыць спрыяльныя ўмовы».

## Да артыкула Аляксея Шаланды
## «Пячатка Ленарта Шчыгельскага, будаўнічага Нясвіжскага замка (1604 г.)»



*Подпіс Ленарта Шчыгельскага на дакуменце 1604 г. НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 4466, арк. 362.*

## Да артыкула Андрэя Блінца
## «Даследаванні радзівілаўскай крыпты ў 2016 г.»





*Фрагменты роспісу на сценах крыпты.*

Да артыкула Андрэя Блінца
«Даследаванні радзівілаўскай крыпты ў 2016 г.»













*Мемарыяльная шыльда пры ўваходзе ў крыпту да рэстаўрацыі (уверсе).*
*Шыльда пасля кансервацыі і адноўленая пячатка*
*Папы Рымскага Бенядзікта XIV (унізе)*

Да артыкула Андрэя Блінца
«Даследаванні радзівілаўскай крыпты ў 2016 г.»





*Гербавы картуш з саркафага Канстанцыі Радзівіл-Чудоўскай да рэстаўрацыі (уверсе) і пасля рэстаўрацыі (унізе).*